# МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА І КЛОПАТ АБ СВАІХ ЛЮДЗЯХ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на ўзаемадзеянне з Экватарыяльнай Гвінеяй. Гэта краіна таксама моцна зацікаўлена ў супрацоўніцтве з Беларуссю. «Яны нас чакаюць. Мы правялі вельмі вялікую работу па супрацоўніцтве з гэтай краінай у плане выпрацоўкі канкрэтнага плана — дарожнай карты», — нагадаў ён. Прэзідэнт пацікавіўся, як на сёння ідуць справы ў гэтым кірунку. Ён падкрэсліў, што хутчэй за ўсё сустрэнецца з Прэзідэнтам Экватарыяльнай Гвінеі Тэадорам Абіянгам Нгема Мбасага, у Эміратах, там і абмяркуюць візіт беларускага лідара ў гэтую краіну. У выпадку сувязяў з Экватарыяльнай Гвіняй размова ідзе і аб перспектывах супрацоўніцтва з шэрагам іншых краін. «Мы маглі б аказаць нейкую падтрымку і дапамогу, перш за ўсё ў тэхналогіях, суседнім дзяржавам», — адзначыў беларускі лідар, дадаўшы, што яшчэ аднай тэмай паездкі ў Дубай стане супрацоўніцтва ўласна з Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі.

Аляксандр Лукашэнка папрасіў праінфарміраваць аб сітуацыі ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве з Кітаем: «Вельмі важная для нас краіна. Натуральна, шмат пытанняў, якія ўрад павінен быў разруліць, калі можна так сказаць, у адносінах з Кітайскай Народнай Рэспублікай».

Прэзідэнт звярнуў увагу, што і ў прэм'ер-міністра Рамана Галоўчанкі запланаваны шэраг сустрэч у Азіі. У сувязі з гэтым кіраўніка дзяржавы асабліва цікавіла, як рухаюцца пытанні супрацоўніцтва з Турцыяй. «Як тут Міністэрства замежных спраў працуе? Наколькі я інфарміраваны, туркі гатовы да перагавораў, і ў тым ліку да вашага візіту, Раман Аляксандравіч, у Турцыю. Рыхтуецца і мой візіт. Але перш чым я пайду туды пажадана, каб глеба была падрыхтавана і былі напрацоўкі пэўных пытанняў», — заявіў Прэзідэнт.

## Святы павінны быць для ўсіх

Кажучы пра пытанні ўнутранага характару, кіраўнік дзяржавы папярэдзіў, што тут на першым месцы — функцыянаванне эканомікі. «Але пры гэтым хачу папярэдзіць урад, што скідак ніякіх не будзе ў плане забеспячэння нармальнай сітуацыі ў перадnavагодні і перадкалядныя святы. Не павінна быць ніякіх праблем з харчаваннем для нашых людзей. Ну, слухайце, каб чагосьці не хапала. Усяго хапае. Толькі наша распарадчасць», — сказаў ён. Асабліва, звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, гэта датычыцца малых гарадоў, аграгарадкоў і вёсак. «Гэта нашы людзі. Гэта некагатыя людзі. Яны павінны быць усім забяспечаны. Святы павінны быць не толькі для начальнікаў і жыхароў Мінска і буйных гарадоў. Святы павінна быць для ўсіх», — сказаў ён. Прэзідэнт звярнуў увагу, што на яго імя цяпер паступае нямала скаргаў наконт забеспячэння ўсім неабходным. «Людзі ёсць людзі. Нешта не спадабалася, настрой дрэнны. Але дыму без агню не бывае», — заўважыў ён.

Аляксандр Лукашэнка асобна папярэдзіў удзельнікаў нарады, і перш за ўсё віцэ-прэм'ера Леаніда Зайца, які адказвае за АПК (дзе нядаўна былі выкрыты факты ў рамках малочнай справы), каб займаліся не толькі гэтымі праблемамі, але і бачылі людзей. «Вы, акрамя ўсяго іншага, адказныя не толькі за Белкаапсаюз, але і за пытанні сельскай гаспадаркі. Яны таксама ўваходзяць у вашы кампетэнцыі», — сказаў ён.

Таксама ўдзельнікі нарады абмеркавалі іншыя пытанні ўнутранага характару і далажылі, як выконваюцца асобныя даручэнні Прэзідэнта.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

---

Блізкая ўлада

# «З ЛЮДЗЬМІ ТРЭБА ЎМЕЦЬ РАЗМАЎЛЯЦЬ»

## Члены Савета Рэспублікі правялі адзіны дзень прыёму грамадзян у Мінску

**Традыцыйна большасць жадаючых падзяліцца сваёй праблемай запісалася на сустрэчу да Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі КАЧАНАВАЙ. Спікер верхняй палаты парламента выслухала людзей у адміністрацыі Кастрычніцкага раёна сталіцы. Спектр пытанняў, якія хвалююць людзей, шырокі: ад паляпшэння жыллёвых умоў да працоўных узаемаадносін і сямейных канфліктаў. Многія звароты датычыліся сферы аховы здароўя.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

### «За гэтым — і іншыя дзеці»

«Вы — мая апошняя інстанцыя», — такімі былі першыя словы Людмілы, калі яна ўвайшла ў кабінет, дзе ажыццяўляўся прыём грамадзян. Мінчанка выхоўвае дзіця-інваліда. У яе дзесяцігадовага сына рэдкае генетычнае захворванне, якое праяўляецца парушэннем работы органаў дыхання і страўнікава-кішачнага тракту. Жанчына расказала, што серыя шпіталізацый, якія ажыццяўляліся на тэрыторыі нашай краіны, не прынеслі чаканага эфекту, і яна вымушана была звярнуцца па медыцынскую дапамогу да расійскіх урачоў. У выніку лячэння самаадчуванне хлопчыка палепшылася. Акрамя таго, на пастаяннай аснове яму неабходна прымаць медыцынскія прэпараты. Адны з іх выпісваюцца бясплатна, іншыя даводзіцца набываць у Расійскай Федэрацыі за немалую суму. А такіх грошай у сям'і няма.

«Тое, што мы пастараемся вам дапамагчы, — гэта адназначна, — сказала Наталля Качанава. — Адзінае, падумаем, як гэта зрабіць. Дзякуй, што вы прыйшлі, бо за гэтым — не толькі ваша дзіця. За гэтым — і іншыя дзеці».

Спікер верхняй палаты парламента ўдакладніла ў **намесніка міністра аховы здароўя Юрыя ГОРБІЧА,** які прысутнічаў падчас прыёму грамадзян, колькі ў Беларусі дзяцей з такім дыягназам. Як высветлілася, на мукавісцыдоз хварэюць 184 хлопчыкі і дзяўчынкі.

Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што нашы медыцынскія спецыялісты павінны ў сваёй дзейнасці ўлічваць праграмы, якія выкарыстоўваюць іх расійскія калегі. У сваю чаргу, намеснік міністра аховы здароўя адзначыў, што пратакол лячэння дадзенага захворвання ўжо пераглядаецца з улікам і расійскага вопыту, і досведу іншых краін. «Той падыход, які ёсць, будзе самым сучасным з усіх магчымых», — удакладніў Юрый Горбіч.

### «Усюды павінны быць парадак і дысцыпліна»

Дырэктара і бухгалтара таварыства ўласнікаў прывяло на прыём грамадзян калектыўнае пытанне. Па меркаванні заяўнікаў, парушаецца заканадаўства аб аплаце: кампанія, якая абслугоўвае іх жылыя дамы, выстаўляе за камунальныя паслугі завышаныя сумы, пры гэтым без тлумачэння прычын.

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, апошнім часам назіраецца вялікая колькасць зваротаў, звязаных з таварыствамі ўласнікаў. «Шмат скаргаў паступае ў адрас старшыняў таварыстваў уласнікаў па прычыне таго, што яны не выконваюць свае абавязкі, — канстатавала яна. — З людзей бяруць усё, што захочуць. Захацелі налічыць за дадатковую паслугу падатак на дабаўленую вартасць — і людзі плацяць».

Па даручэнні Наталлі Качанавай, адпаведная інфармацыя будзе перададзена Камітэту дзяржаўнага кантролю, які ў найбліжэйшы час праверыць правільнасць налічэння камунальных паслуг альтэрнатыўнымі ЖКГ кампаніямі.

Са скаргай на дзейнасць таварыства ўласнікаў прыйшла і жыхарка аднаго са сталічных шматпавярховікаў. Галіна Пятроўна на працягу многіх гадоў узначальвала таварыства, пры ёй быў парадак. Калі ж яна пайшла на пенсію і кіраўніцтва змянілася, пытанні, якія ўваходзяць у кампетэнцыю таварыства, не вырашаюцца. Больш за тое, утварыліся запазычанасці па аплаце камунальных паслуг. Апошняй кропляй стала звальненне старшыні таварыства ўласнікаў, згоды на якое жыхары кааператыва не давалі. У выніку кіраўніцтва адміністрацыі Фрунзенскага раёна сталіцы, на балансе якога знаходзяцца дамы, прызначыла ўпаўнаважаную асобу, адказную за кааператыў. Аднак пытанні дагэтуль не вырашаюцца. Пры гэтым раённая ўлада не ўзгадняе кандыдатуру на пасаду старшыні таварыства ўласнікаў.

Звяртаючыся да **кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна г. Мінска Сяргея ШКРУДНЕВА,** Наталля Качанава заўважыла, што старшыню таварыства ўласнікаў выбірае і вызваляе ад пасады агульны сход. «Прызначыўшы ўпаўнаважаную асобу, вы зрабілі няправільна, — удакладніла спікер. — Яна (былы старшыня таварыства ўласнікаў. — **«Зв».**) матэрыяльна адказная асоба, яна павінна была даць справаздачу перад людзьмі за гэтую дзейнасць».

Спікер верхняй палаты парламента канстатавала, што таварыствы ўласнікаў стварылі кучу праблем. «У нас ёсць дзяржаўныя прадпрыемствы, якія абслугоўваюць дамы не горш, а можа, і лепш, чым таварыствы ўласнікаў, — заўважыла яна. — Усюды павінны быць парадак і дысцыпліна. Трэба вяртацца да нармальнай структуры жыллёва-камунальнай гаспадаркі».

Пры гэтым Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што раз кіраўніцтва раёна не ўзгадняе кандыдатуру на пасаду таварыства ўласнікаў, то павінны патлумачыць канкрэтную прычыну, а не абмяжоўвацца шаблоннымі адпіскамі. «З людзьмі трэба ўмець размаўляць, — звяртаючыся да прысутных прадстаўнікоў улады, падкрэсліла спікер. — Калі навучыцеся размаўляць — пытанняў стане напалову менш».

**Вераніка КАНЮТА.**

*З якімі яшчэ пытаннямі людзі звярталіся да Наталлі Качанавай і іншых членаў Савета Рэспублікі, чытайце ў заўтрашнім нумары.*

### У тэму

У размове з журналістамі спікер верхняй палаты парламента нагадала, што прыёмы грамадзян па асабістых пытаннях члены Савета Рэспублікі праводзяць штомесяц. «Мы бачым, што тэматыка зваротаў практычна ідэнтычная, — канстатавала Наталля Качанава. — Адзінае, усялякі раз з'яўляюцца пэўныя пытанні, якія нам важныя для работы. У прыватнасці, калі размова ідзе аб выплаце падаткаў у выпадку, калі чалавек памірае і ў яго ёсць пэўныя абавязацельствы. Мы для сябе зрабілі выснову, што трэба паглядзець, як заканадаўства трактуе гэтыя нормы і што сёння яшчэ можна зрабіць, каб людзі, трапляючы ў такую сітуацыю, маглі адчуваць сябе абароненымі. У большай ступені, вядома, сям'я, у якой адбылася такая бяда».

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, нямала пытанняў, якія датычацца сістэмы аховы здароўя. «На жаль, іх менш не становіцца, — адзначыла яна. — Думаю, гэта зыходзячы яшчэ з таго, што працуе рабочая група, Прэзідэнт праводзіў вельмі сур'ёзную нараду па пытаннях аховы здароўя. На жаль, гэта праблема мае месца. І не толькі па аказанні медыцынскіх паслуг нашым грамадзянам, але і па пратаколах лячэння. Тут трэба вельмі сур'ёзна разбірацца».

Спікер звярнула ўвагу на тое, што на прыёмы запрашаюцца службовыя асобы, якія чуюць аб той ці іншай праблеме з першых вуснаў. «Для чаго гэта робіцца? Пакуль гэты зварот дойдзе да таго ці іншага дзяржаўнага органа, яны ўжо пачынаюць актыўна займацца гэтымі пытаннямі, — патлумачыла Наталля Качанава. — Тады, калі ідзе запіс, яны ўжо вывучаюць гэтыя пытанні і прыходзяць падрыхтаванымі, каб, магчыма, адразу даць кваліфікаваны адказ на тое ці іншае пытанне — і ўжо ў працэсе прыёму многія пытанні вырашаюцца».

Старшыня Савета Рэспублікі падзялілася, што больш за ўсё яе непакояць пытанні, якія датычацца функцыянавання таварыстваў уласнікаў. Наталля Качанава паведаміла, што адпаведны законапраект ужо прайшоў першае чытанне ў Палаце прадстаўнікоў. «Вельмі важна своечасова і аператыўна прымаць рашэнні на ўзроўні органаў мясцовай улады, рэспубліканскіх органаў кіравання для таго, каб не дапусцаць падобнага надалей», — рэзюмавала яна.

---

# «ГЭТА ПРАДПРЫЕМСТВА МЫ ЗАХАВАЕМ»

**Унікальная вытворчасць, унікальныя спецыялісты, прадукцыя карыстаецца попытам далёка за мяжой, а з эканомікай — праблемы. Як такое можа быць? Менавіта такое пытанне задала кіраўніцтву прадпрыемства і Белкаапсаюза Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА падчас сустрэчы з калектывам дызайн-цэнтра па пашыве вырабаў з натуральнага футра GNL гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Белкаапзнешгандаль Белкаапсаюза».**

Наталля Качанава адзначыла, што гэта ўнікальны швейны цэх з выключнымі спецыялістамі, якіх у краіне адзінкі. Зробленыя імі футры карыстаюцца попытам не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Так, на нядаўняй выставе ў Шанхаі ўсе былі проста ў захапленні ад вырабаў, якія яны шыюць. Таксама вялікі попыт на іх у Расіі. «І што мы бачым? Пайшлі па шляху найменшага супраціўлення — зменшылі штат, страцілі такіх спецыялістаў, якіх потым не знайсці. Таму, калі я даведалася пра сітуацыю, то вырашыла высветліць яе на месцы, абавязкова сустрэцца з калектывам, выслухаць людзей. Адразу скажу — гэтае прадпрыемства мы захаваем, а калі яно не патрэбна Белкаапсаюзу, то перададзім яго Беллегпраму або Мінску, нездарма тут прадстаўнікі і канцэрна, і Мінгарвыканкама. Але яно будзе працаваць, мы не дазволім развальць унікальную вытворчасць, зробім усё, каб захаваць гэты калектыў, каб у людзей была дастойная заработная плата, каб яны спакойна працавалі і не хваляваліся за заўтрашні дзень», — сказала Старшыня Савета Рэспублікі.

Абмеркавалі на сустрэчы і далейшую стратэгію вытворчай дзейнасці прадпрыемства: Наталля Качанава пагадзілася з прапановай супрацоўнікаў адысці ад работы толькі «пад заказ», як гэта адбываецца зараз, і актыўна пашыраць асартымент. Яна справядліва адзначыла, што калі дызайн-цэнтр замкнецца толькі на заказах, то што будзе ў яго крамах? Канешне, трэба распрацоўваць і шыць новыя мадэлі, запатрабаваныя ў спажыўцоў. Як беларускіх, так і замежных, напрыклад, кітайскіх, якія былі вельмі ўражаны якасцю і прыгажосцю вырабаў з таго ж лісінага футра.

Яшчэ адзін момант — пераемнасць пакаленняў. На жаль, моладзь на прадпрыемстве не затрымліваецца па тых ці некіх прычынах. А сённяшнім работнікам сапраўды ёсць чаму навучыць маладых майстроў, перадаць свой велізарны вопыт, уменні.

На працягу размовы Наталля Качанава засяродзіла ўвагу прысутных на бягучай сітуацыі ў краіне і ў свеце: «Вы самі бачыце, якія зараз адбываюцца падзеі на знешнім контуры ў жыцці ўсіх краін. Таму самае галоўнае цяпер — захаваць мір і спакой у нашай дзяржаве. Захаваць і прымножыць усё тое, чаго дасягнулі мы з вамі, працуючы ўвесь час для нашай суверэннай і незалежнай краіны».

«Імпартазамяшчэнне — гэта тое, аб чым заўсёды гаворыць Прэзідэнт, — сказала Наталля Качанава. — І сёння ўсе нацэлены на тое, каб выпускаць сваю прадукцыю і забяспечыць, перш-наперш, сваіх людзей. Прэзідэнт заўсёды гаворыць, што калі гэта патрэбна для краіны, то гэта трэба рабіць...»

**Уладзімір ВЯРЭНІЧ.**